# Ад Рэдакцыі

Няма такога народу, што не патрабаваў–бы навукі, а мы, Крывічы, або Беларусы, асабліва яе патрабуем. За апошнія 150 год нашае гісторыі, калі наш народ, страціўшы сваю незалежнасьць, жыў безгаспадарстваным нявольным жыцьцём, нашая навука ляжала дзірваном. За гэты час сьвет пайшоў далёка ўперад. Навучоныя чужыя, а нашыя нацыянальна нясьведамыя пад нацыянальнай фірмой чужой, шмат чаго вынайшлі, адкрылі, стварылі. Цяперашнія навучоныя нашыя, ужо нацыянальна сьведамыя, не патрабуюць гэтага рабіць нанава, могуць ісьці далей. Але ё галіны веды вельмі нацыянальныя, такія, як навука нацыянальнае мовы й літаратуры, гісторыі свае бацькаўшчыны, яе этноґрафіі, археолёґіі, а ў ладнай меры й пазнаньне прыродных багацьцяў роднага краю і яго гаспадарскіх магчымасьцяў. У гэтых галінах веды ніколі чужнік ня зробе таго, што навучоны свайго народу. І пагатове ня могуць зрабіць гэтага тыя чужнікі, што часта падыходзяць тэндэнцыйна да пытаньняў, зьвязаных із жыцьцём нашага народу. Дзеля таго асабліва ў менаваных галінах веды, галінах так нам патрэбных, мы Крывічы асталіся далёка ззаду ад іншых. Дык мусім даганяць. Навука нам тут патрэбная, як хлеб штадзенны. А тымчасам у нашай бацькаўшчыне–Беларусі маладая навука крывіцкая, што так хараша стала разьвівацца ў 20–ых гадох, запынена, нат чыста задушана рукамі комуністычнае Масквы, а ейныя сьвятары адныя забітыя, другія гінуць у няшчысьлёных савецкіх турмах і концтабарах. Цяпер навуковыя ўстановы Беларусі, замест запраўднае навукі, популярызуюць „навуку“ Леніна й Сталіна. Дык адказнасьць за крывіцкую навуку ляжыць на навучоных крывіцкае эміграцыі. Ім не даець загадаў НКВД, ані ніхто іншы, яны могуць працаваць аб’ектыўна. Дыкжэ заданьне разьвіваць крывіцкую навуку ўзялі на сябе навучоныя, зарганізаваныя ў Крывіцкім Навуковым Т–ве Пранціша Скарыны. Ужо пяты год, як гэтае Т–ва працуе. Але жаль, што дагэтуль праца крывіцкіх навучоных на чужыне магла бачыць сьвет толькі ў хорме рэфэратаў, чытаных на навуковых пасяджэньнях Т–ва, зь якіх можа карыстаць толькі малая колькасьць людзёў. Як кажная навуковая арганізацыя, так і нашая складаецца з малое колькасьці сяброў, каторых складак аніяк ня можа стаць на выдавецтва Т–ва. Доля „Веды“, а зь ёй у ладнай меры і беларускай або крывіцкай веды–навукі наагул, залежыць вылучна ад паддзяржаньня яе матар’яльна беларускай эміграцыяй. Калі гэтая эміграцыя зразумее сваю і ўсяго нашага народу надзвычайную патрэбу ў сваім навуковым часапісе, яна нам паможа, і часапіс наш будзе разьвівацца, зможам таксама рабіць дадаткі для моладзежы; калі не зразумее, „Веда“ замрэць.

Таварыства нашае завецца „Крывіцкім“ — старым запраўдным назовам нашага народу; але пакуль гэты назоў агульна й канчальна ня прыняты як адзіны сучасны назоў нашага народу, у „Ведзе“ могуць і будуць ужывацца таксама іншыя нашыя назовы, як другі праўдзівы назоў нашага народу „Літва“, „Ліцьвіны“, і як накінены нам Масквою, але нядаўна пашыраны і цяпер яшчэ ўжываны назоў „Беларусы“. У кажным артыкуле будзе тый назоў, які ўжывець аўтар.

# Трэба нам свая друкарня

Нам, Беларусам, канечне трэба свая друкарня ў Амэрыцы. Друкарня трэба, бо мусім мець свае выданьні, свае часапісы, газэты, кніжкі. Без свайго друку ня будзе ў нас нацы-